# Роля гарадоў Беларусі ў фарміраванні капіталістычных адносін і разлажэнні феадалізму

**Ю. У. Врублеўскі**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры сацыяльнай работы БДПУ, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства гімназіі № 40 г. Мінска

Змест гістарычнай адукацыі сучаснай школы насычаны разнастайным тэарэтычным матэрыялам, з якім вучні пачынаюць знаёміцца на II ступені сярэдняй адукацыі (V—IX класы). Асаблівасці першабытнага грамадства вывучаюцца ў V класе, характэрныя прыкметы феадалізму — у VI—VII класах, зараджэнне і развіццё капіталістычных адносін разглядаюцца ў VIII—IX класах [1]. У далейшым, з пераходам на канцэнтрычную мадэль навучання, плануюцца карэкціроўкі ў пабудове зместу навучання. Перад настаўнікам гісторыі стаіць важная задача — забяспечыць разуменне сутнасці складаных тэарэтычных схем, якія канцэнтруюцца ў межах пэўных тэм. Для развіцця гістарычнага светапогляду вучняў і іх каштоўнасных уяўленняў узрастае патрэба ў навукова-метадычным асэнсаванні істотных гістарычных праблем. У іх шэрагу — праблема ролі гарадоў на тэрыторыі Беларусі ў фарміраванні капіталістычных адносін. Мэта артыкула — метадычна акрэсліць шляхі выкарыстання навуковых падыходаў па праблеме развіцця феадальнага горада ў межах школьнай праграмы. Матэрыялы артыкула можна выкарыстоўваць пры вывучэнні пытанняў гарадскога развіцця, праблем феадалізму, а таксама пры асэнсаванні праблемы генезісу капіталізму.

Пра зараджэнне капіталістычных адносін у межах феадалізму распавядаецца ў падручніку па гісторыі Беларусі для VIII класа. Гэтай тэме прысвечаны матэрыялы параграфа «Гарады Беларусі ў другой палове XVII — першай палове XVIII стст.». У гэты перыяд горад стаў яскравым прыкладам для вывучэння праблемы фарміравання раннекапіталістычных адносін. Пад уплывам мануфактурнай вытворчасці ў першай палове XVIII ст. фарміруюцца капіталістычныя адносіны [2, с. 104]. Для забеспячэння трывалых уяўленняў вучняў мэтазгодна даць тлумачэнне сэнсу праблемы генезісу капіталізму, месца феадальнага горада ў гэтым працэсе.

Генезіс таварнай вытворчасці, які прадугледжвае паступовую змену трох яе форм: рамяство (дробнагандлёвая або простая таварная вытворчасць) — мануфактурная вытворчасць — капіталістычная фабрыка (буйная прамысловасць або капіталістычная вытворчасць), сёння прапануецца ў якасці тэарэтычнай схемы. Разам з тым на працягу панавання феадальных адносін (да XIX ст.) ніводная з стадый не перапыніла свайго існавання і поўнасцю не вычарпала сябе або не выціснула іншую. Таму спецыфіка пытання зараджэння капіталістычных адносін закранае праблему існавання феадалізму.

Для больш дакладнага ўяўлення вучнямі гэтага працэсу мэтазгодна зрабіць агаворку пра з'яўленне асобных элементаў капіталістычнага ўкладу ў межах феадальнага горада. Адным з такіх элементаў была мануфактурная вытворчасць. Як ад-

значаюць аўтары школьнага падручніка, мануфактуры з'яўляліся пераходнай стадыяй паміж рамяством і капіталістычнай фабрыкай і пачалі зараджацца ўжо ў пачатку XVIII ст. [2, с.105]. У сваю чаргу, адметнасцю мануфактурнай вытворчасці на беларускіх землях было выкарыстанне не вольнанаёмнай, а прымусовай працы прыгонных сялян і наяўнасць уласнай сельскагаспадарчай і лясной сыравіны.

Зараджэнне капіталізму ў некаторых выпадках звязвалася і з развіццём рамеснай вытворчасці. Агульныя ўмовы развіцця беларускіх гарадоў у XVII—XVIII стст., перадумовы эканамічнага заняпаду ў другой палове XVII — першай палове XVIII стст. акрэсліў у сваіх працах вядомы беларускі гісторык А. П. Ігнаценка. Аналізуючы рамесную вытворчасць, ён імкнуўся паказаць ролю некаторых рамесных галін у ператварэнні іх у капіталістычныя мануфактуры. У якасці абгрунтавання даследчык аперыраваў некаторымі выпадкамі выкарыстання майстрамі наёмнай працы і пашырэннем дзейнасці скупшчыкаў [3]. Апошняе сцвярджэнне само па сабе не сведчыць аб шляхах станаўлення капіталістычнай мануфактуры. Зварот да адзінкавых выпадкаў выкарыстання наёмнай працы ў дастатковай ступені факталагічна не абгрунтаваны. Тым больш што рамяство заўсёды было антыподам капіталістычнай прамысловасці, бо з'яўлялася элементам натуральнай гаспадаркі. Таму не зусім мэтазгодна звязваць гэтыя працэсы з эвалюцыяй феадальнага горада ў XVII і нават у XVIII стст.

Што ўвогуле ўяўляў сабою феадальны горад? Ці існаваў ён? Наколькі мэтазгодна адасабляць яго ад існуючай феадальнай сістэмы парадкаў? Якую ролю адыгрываў горад у развіцці феадальнага прагрэсу? Пастаноўка дадзеных пытанняў дазволіць вучням больш грунтоўна разумець тэарэтычныя канструкцыі ўмоў феадальнага ладу і яго далейшых пераўтварэнняў.

У гістарычнай навуцы існуе некалькі падыходаў да праблемы вызначэння сутнасці горада перыяду Сярэднявечча і Новага часу, яго дваістага характару. З імі варта пазнаёміцца ў працэсе навучання на ўроках гісторыі. Згодна з першым падыходам, горад разглядаўся як супрацьлегласць феадалізму або частка, якая выдзялялася з феадалізму. У адпаведнасці з другім — горад разглядаўся як арганічная структура феадальнай сістэмы. Вядома, што феадальная сістэма заснавана на буйной зямельнай уласнасці і іерархічнай сістэме арганізацыі ўнутры класа землеўласнікаў. Якое дачыненне да гэтай тэарэтычнай схемы мае горад? У якасці гістарычнай формулы, што дазволіць параўнаць абодва падыходы, магчыма разгледзець наступную інтэрпрэтацыю горада. «Гарады ўвасаблялі новы этап у падзеле працы, аддзяленні рамяства ад сельскай гаспадаркі, прадстаўлялі сабою эканамічныя і сацыяльныя сілы, за якімі была будучыня. У горадзе найперш у эпоху Сярэднявечча адбывалася бурнае развіццё рамяства і гандлю, таварна-грашовых адносін, у яго нетрах выспявалі перадумовы разлажэння феадалізму і зараджаліся раннекапіталістычныя адносіны» [4, с. 18]. З яе вынікае, што горад паскорыў працэс разлажэння феадалізму. Не пераацэньваючы значэнне гэтай акалічнасці, засяродзім увагу на важных гістарычных асаблівасцях.

Па-першае, як бы ні адасабляўся горад ад вёскі (сістэма натуральнай гаспадаркі ў цэлым) і супрацьстаяў ёй, апошняя аказвала на яго прыкметны ўплыў. Істотным фактарам феадалізацыі горада была яго «аграрная перыферыя». Адначасова горад быў пляцоўкай пераразмеркавання феадальнай рэнты, якая зноў жа цягнулася з вёскі. Па-другое, як падкрэсліваў беларускі гісторык А. Карпачоў, прыватнае ўладанне гарадскімі землямі, падлеглымі магістрату, як гараджанамі, так і феадаламі, уяўляла сабою пэўную форму феадальнай зямельнай уласнасці. Магістрацкія землі, якія былі ў спадчынным уладанні мяшчан, знаходзіліся ў «падзеленай уласнасці», пры якой вярхоўным уласнікам зямлі быў магістрат [5, с. 516]. Шэраг гісторыкаў звяртае ўвагу на гарадское мяшчанства, якое пачало інтэгравацца ў саслоўны лад грамадства і займала важнае месца ў яго іерархіі [6]. З дапамогай прыведзеных фактаў магчыма

прапанаваць наступныя феадальныя прыкметы горада: узаемаўплыў горада і вёскі; існаванне феадальнай зямельнай уласнасці ўнутры горада; фарміраванне гарадскога саслоўя; горад — цэнтр пераразмеркавання феадальнай рэнты.

Акрамя гэтых прыкмет, увагу вучняў можна таксама засяродзіць на характары прававой арганізацыі горада, падначаленай феадальнай сістэме кіравання. Доўгія часы ўнутры горада існавалі карпаратыўна-абшчынныя формы: цэхі, брацтвы, гільдыі. Такім чынам, па сваёй сацыяльнай сутнасці гэта быў феадальны горад [6; 7].

Тым самым, разглядаючы прыроду сярэднявечнага горада, неабходна звярнуць увагу на наступнае. Горад — гэта складаны сацыяльны арганізм, які ўскладняецца ў сваім развіцці. Горад садзейнічаў росквіту феадальнай фармацыі і ён жа знаходзіўся ў вытоках яе заняпаду. Таму не зусім карысна адасабляць яго поўнасцю ад феадальнай сістэмы грамадства і звязваць з цывільнай прасторай рэчаіснасці. Унутры горада доўга захоўваліся праяўленні феадальнай гаспадаркі, якія паступова выцясняліся больш прагрэсіўнымі (раннекапіталістычнымі) элементамі. Пры гэтым, калі казаць пра зародкі капіталізму (ліхвярства, дзейнасць скупшчыкаў, выкарыстанне наёмнай працы, дробнагандлёвая рамесная вытворчасць), то варта вызначыць, у якіх адносінах яны знаходзіліся з характарам натуральнай гаспадаркі феадальных гарадоў. Адсутнасць устойлівых рыначных сувязяў стрымлівала іх развіццё. Гандлёвая функцыя горада, як і ў ранейшыя часы, захоўвала вырашальнае значэнне.

Галоўнымі асаблівасцямі працэсаў феадалізацыі ў Беларусі былі яе замаруджанасць і запаволенасць у часе (да XIX ст.). Як прыклад, найбольш інтэнсіўнае развіццё ў гарадах Беларусі атрымалі рамёствы ў параўнанні з мануфактурамі і фабрыкамі. На думку беларускіх гісторыкаў А. Э. Лютай і А. М. Лютага, гэта з'ява была выклікана поўнай адсутнасцю адной з найважнейшых умоў, неабходных для развіцця буйной прамысловасці, — значных капіталаў у купцоў і мяшчан. Свой адбітак на гэты працэс аказвалі наяўнасць вялікай колькасці прыватнаўласніцкіх гарадоў, канкурэнцыя рускіх купцоў і прамыславікоў, частыя ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў XVIII — пачатку XIX стст. і звязаныя з імі разарэнні і заняпад гаспадарчага жыцця і інш. [8]. Засілле паншчыннай сістэмы перашкаджала фарміраванню кадраў вольнанаёмных рабочых, што стрымлівала развіццё капіталізму. Па падліках навукоўцаў, колькасць рамесных спецыяльнасцей павялічваецца з 78 у другой палове XVIII ст. да 100 у першай палове XIX ст.

Яшчэ адна асаблівасць, якую неабходна мець на ўвазе, — гэта роля рамесных майстэрань у генезісе капіталізму ў Беларусі. Большасць дробных капіталістычных прадпрыемстваў і мануфактур выраслі не непасрэдна з іх, а былі створаны паралельна. Рамесная ж вытворчасць служыла толькі базай для развіцця капіталістычнай прамысловасці як школа падрыхтоўкі кваліфікаваных наёмных рабочых, таму часцей за ўсё ўладальнікамі капіталістычных прадпрыемстваў былі купцы, а не майстры-рамеснікі [8].

Вывучэнне пытанняў феадалізацыі грамадства і месца гарадоў у гэтым працэсе дае ўяўленні аб зараджэнні элементаў капіталізму і пераходзе да капіталістычнага грамадскага ладу жыцця. Асэнсаванне ролі гарадоў будзе садзейнічаць актывізацыі ўвагі да гістарычнага мінулага і больш эфектыўна паўплывае на развіццё тэарэтычнага мыслення школьнікаў.

**Практычныя markdown-free розна ўзроўневыя заданні**

***I узровень***

*Варыянт 1.* Устаўце прапушчаны элемент сказа:

Адметнасцю мануфактурнай вытворчасці на беларускіх землях было выкарыстанне не вольнанаёмнай працы, а ... працы ... сялян і ўласнай сельскагаспадарчай і лясной ... .

*Варыянт 2.* Устаўце прапушчаны элемент сказа:

Доўгія часы ўнутры горада існавалі карпаратыўна-абшчынныя формы: цэхі, ... , ... .

***II узровень***

*Варыянт 1.* Растлумачце значэнне гістарычных паняццяў: *горад, феадальны горад, мануфактура.*

*Варыянт 2.* Растлумачце значэнне гістарычных паняццяў: *простая таварная вытворчасць, рамесная майстэрня, феадалізм.*

***III узровень***

*Варыянт 1.* Вызначце ўзаемасувязь наступных гістарычных паняццяў: рамесная майстэрня ↔ мануфактура.

*Варыянт 2.* Вызначце ўзаемасувязь наступных гістарычных паняццяў: феадальны горад ↔ вёска.

***IV узровень***

*Варыянт 1.* Вызначце і ахарактарызуйце прыкметы феадальнага горада.

*Варыянт 2.* Вызначце і ахарактарызуйце асаблівасці працэсаў феадалізацыі ў Беларусі.

***V узровень***

*Варыянт 1.* Параўнайце паміж сабой погляды навукоўцаў на праблему дваістасці феадальнага горада.

*Варыянт 2.* Беларускі гісторык А. П. Ігнаценка, аналізуючы рамесную вытворчасць, імкнуўся паказаць ролю некаторых рамесных галін у ператварэнні іх у капіталістычныя мануфактуры. Ці можна пагадзіцца з гэтым меркаваннем? Свой адказ абгрунтуйце.

**Спіс цытаваных і выкарыстаных крыніц**


1. Учебные программы для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения. Всемирная история. История Беларуси. V—XI классы.
2. *Белозорович, В. А.* История Беларуси, вторая половина XVI — конец XVIII в. : учеб. пособие для 8-го кл. общеобразоват. учр. с рус. яз. обучения / В. А. Белозорович, П. П. Крень, Н. Н. Ганущенко. — Минск : ИЦ БГУ, 2010. — 191 с.
3. *Игнатенко, А. П.* Ремесленное производство в городах Белоруссии XVII—XVIII вв. / А. П. Игнатенко. — Мпнск : Изд-во М-ва высш., сред. спец. и проф. образования БССР, 1963. — 87 с.
4. *Котельникова, Л. А.* Феодализм и город в Италии в VIII—XV вв. По материалам центральных и северных областей / Л. А. Котельникова. — М. : Наука, 1987. — 256 с.
5. *Карпачёв, А. М.* Городское землевладение в королевских городах Белоруссии XVII—XVIII вв. (к вопросу о городском землевладении в Речи Посполитой) / А. М. Карпачёв // Советское славяноведение. — Минск : ИЦ БГУ, 1969. — С. 509—516.
6. *Сванидзе, А. А.* Средневековые города /А. А. Сванидзе // История Европы: в 8 т. — М. : Наука. — Т. 2: Европа в период развитого феодализма. — 1992.
7. *Дзярновіч, А.* Некаторыя метадалагічныя праблемы даследавання ўрбаністычных супольнасцяў позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу / А. Дзярновіч // Гістарычная ўрбаністыка : асновы метадалогіі і крыніцазнаўчая база : зб. навук. арт. — Гродна, 2011. — С. 31–38.
8. *Люты, А. М.* Рамесная і дробнатаварная вытворчасць у Беларусі ў канцы XVIII — першай палове XIX ст. / А. М. Люты, А. Э. Лютая // Палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і этнакультурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў XIX — пачатку XX ст. (Да 150-годдзя скасавання прыгоннага права ў Расійскай імперыі) : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка ; рэдкал. : А. П. Жытко [і інш.]. — Мінск, 2011. — С. 11—19.